На Беларусі пакуль інтэлектуальным гульням не надавалася, ды і па шэрагу прычын не надта надаецца і ў сучасны момант сур'ёзнай увагі. Выкарыстаць жа гэтыя гульні магчыма паўсюдна, бо іх займальнасць, цікавасць, азарт, магчымасць праявіць сябе з найлепшага боку прыцягваць увагу большасці людзей. Бібліятэка, у якой няўмольна зніжаецца колькасць чытачоў, магла б пры дапамозе інтэлектуальных гульняў з поспехам уздзейнічаць на гэты негатыўны працэс. Патрэбна толькі адпаведная падрыхтоўка самога бібліятэкара. Таксама можна выкарыстаць з нязменшым эфектам інтэлектуальныя гульні ў сацыяльнай педагогіцы, бо яны могуць быць адным з важнейшых каналаў усталявання прамой сувязі з адпаведнымі сацыяльнымі групамі.

Рагачова Л.М.,
канд.гістар.навук,
ст.выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТРАДЫЦЫЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў ФАРМІРАВАННІ ПРАФЕСІЙНАЙ КУЛЬТУРЫ РАБОТНІКАЎ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Дынаміка сучасных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў заканамерна выклікае новыя патрабаванні да сістэмы адукацыі, і падрыхтоўкі культуролагаў у тым ліку.

Сітуацыя, якая склалася сёння ў сферы культуры, характарызуецца зрушэннем прыярытэтаў і каштоўнасцей у бок камерцыі. Гэта прыводзіць, з аднаго боку, да скарачэння культурных кантактаў значнай часткі насельніцтва (пажылыя людзі, падлеткі, катэгорыі з фіксаванымі даходамі), а з другога - да зніжэння якаснага ўзроўню культурных мерапрыемстваў. Па сутнасці ў новых умовах вызначылася тэндэнцыя да згортвання гуманістычнай, развіваючай, выхаваўчай функцый устаноў культуры, якія арганізуюць вольны час.

У гэтых умовах значна ўзрастае роля работнікаў культуры, павышаюцца патрабаванні да іх агульнай і прафесійнай культуры. Маладыя спецыялісты павінны быць гатовы да гібкага рэгулявання культурных працэсаў на месцах,да захавання прыярытэтных і традыцыйных функцый культуры: раскрыцця сутнасных сіл чалавека, яго маральна-эстэтычнага выхавання, ажыццяўлення гуманістычнай накіраванасці шматскладанай і разнастайнай дзейнасці ўстаноў культуры.

Зразумела, што на падрыхтоўку такіх спецыялістаў накіраваны ўвесь працэс навучання ў ВНУ. Адным з яго напрамкаў з'яўляецца рэалізацыя ў ходзе навучання працэсу духоўнага абнаўлення грамадства. Яго аснову складае адраджэнне нацыянальных традыцый, звычаяў, свят, якія нясуць у сабе не толькі унікальны нацыянальны змест, але і глыбокую гуманістычную накіраванасць. Не выклікае сумнення, што веданне і разуменне будучымі культуролагамі нацыянальнай духоўнай спадчыны, яе багацейшага педагагічнага зместу дазволіць стварыць неабходную базу для пераадолення негатыўных тэндэнцый, выявіўшыхся ва ўмовах рынкавых адносін у сферы вольнага часу.

Вялікія магчымасці ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў закладзены ў асэнсаванні народнай педагагічнай культуры на падставе міжпрадметных сувязей у працэсе навучання. Перш за ўсё гэта тычыцца такіх дысцыплін, як псіхалогія, філасофія, этнаграфія. Але не менш спрыяльныя ўмовы для фарміравання высокай прафесійнай культуры студэнтаў складваюцца ў галіне ўзаемапранікнення народнай педагогікі і дысцыплін мастацкага цыкла, якія дапамагаюць вывучаюць культурную спадчыну беларускага народа.

У працэсе разгляду з'яў культурнага жыцця на падставе ўзаемасувязі гэтых дысцыплін дасягаецца цэласнае ўспрыманне вывучаемых аб'ектаў. Асобныя, аддаленыя веды, уменні прадстаюць у адзінай сістэме, што садзейнічае выпрацоўцы навуковага светапогляду ў студэнтаў.

Акрамя таго, міжпрадметныя сувязі садзейнічаюць узмацненню дыялектычнага характару атрымліваемых ведаў, ствараюць спрыяльныя ўмовы для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Асабліва наглядна гэта праяўляецца пры напісанні курсавых работ па педагогіцы, дзе неабходна адлюстраваць не толькі важнейшыя аспекты культуралагічнай дзейнасці, выявіць іх педагагічную сутнасць, але і разгледзець гэтую дзейнасць у яе развіцці, зрабіць педагагічны прагноз.

Да ліку важнейшых станоўчых характарыстык выкарыстання міжпрадметных сувязей у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсе навучання неабходна аднесці таксама пашырэнне магчымасцей для развіцця мысліцельнай дзейнасці студэнтаў на падставе самастойнага супастаўлення даных розных навук аб адных і тых жа падзеях. Так, пры вывучэнні тэмы "Эстэтычнае выхаванне асобы", акрамя выкарыстання псіхолага-педагагічных ведаў, студэнты самастойна даюць аналіз асноўных форм работ устаноў культуры, ацэньваюць іх педагагічны і эстэтычны змест. У працэсе такой работы ў іх фарміруецца крытычны склад мыслення, выпрацоўваецца практычны падыход да будучай дзейнасці.

Як паказвае практыка, выкарыстанне міжпрадметных сувязей дапамагае ажыццяўляць адзіны падыход да рашэння агульных задач у падрыхтоўцы работнікаў культуры. Акрамя таго, у маладых спецыялістаў фарміруюцца сістэмнасць і дыялектычнасць за ўспрыманні рэчаіснасці, творчы падыход да працы, развіваюцца прагнастычныя здольнасці, што забяспечвае павышэнне прафесійнай культуры студэнтаў

Яноўскі М.З.,
канд.псіхал.навук,
дацэнт

## УДАСКАНАЛЕННЕ ПСІХАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ У ВНУ КУЛЬТУРЫ

Паспяховая рэалізацыя прафесійных практычных задач культуролагамі ў розных сферах дзейнасці ў значнай меры залежыць ад узроўню іх псіхалагічна-педагагічнай культуры і падрыхтоўкі. Веданне заканамернасцей, асаблівасцей функцыяніравання асобы ўвогуле і ў мастацка-творчай дзейнасці ў прыватнасці з'яўляецца важнай умовай аптымальнай арганізацыі, кіравання гэтай дзейнасцю ў сістэме "чалавек - чалавек".

У шырокім сэнсе глыбокія і змястоўныя агульныя псіхалагічна-педагагічныя веды дазваляюць навукова абгрунтаваць, прадуктыўна і з найменшай затратай сіл арганізаваць, удасканальваць і карэкціраваць прафесійнае станаўленне будучага спецыяліста, развіццё яго на агульна-асабовым і прафесійным узроўнях.

Акрамя гэтага, змястоўная псіхолага-педагагічная падрыхтоўка спецыялістаў мастацка-творчай дзейнасці пашырае паняцце шляхоў, спецыфікі і заканамернасцей развіцця асобы ўвогуле і ў сферы мастацтва ў прыватнасці. Веданне механізмаў прафесійнай актыўнасці, матываў далучэння да мастацтва, фарміравання ўстойлівых установак, інтарэсаў, веданне патрэбнасці асобы ў мастацкай дзейнасці -- важныя, значныя практычныя задачы, якія пастаянна ўзнікаюць у арганізатараў мастацкай творчасці. Відавочна таксама, што без уліку і разумення індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей асобы: тэмпераменту, характару, здольнасцей, тыпу вышэйшай нервовай дзейнасці, суадносін першай і другой сігнальных сістэм -- цяжка будаваць працэс навучання спецыяльным уменням, навыкам, выбраць адэкватныя формы ўздзеяння на асобу ўдзельніка самадзейнага калектыву.

Раскрыццё, разуменне і ўсведамленне механізмаў функцыянавання кагнітыўных працэсаў у структуры асобы: успрымання, памяці, мыслення, уяўлення, уважлівасці -- будуць садзейнічаць пабудове працэсу навучання ў розных відах мастацкай дзейнасці больш накіравана і асэнсавана.

Веданне сацыяльна-псіхалагічнага узроўню асобы раскрывае вельмі важныя аспекты жыццядзейнасці творчых калектываў рознага тыпу, шляхі іх станаўлення і арганізацыі. Значнае месца тут займаюць праблема кіравання калектывам, міжасабовымі зносінамі, вывучэнне канфліктаў і шляхоў іх вырашэння, заканамернасцей і асаблівасцей жыццядзейнасці асобы ў творчым калектыве і інш.

Аналіз разумення значнасці, магчымасці выкарыстання псіхолага-педагагічных ведаў у прафесійнай мастацка-творчай дзейнасці сведчыць, што статус гэтых ведаў і патрэбнасць у іх будучых спецыялістаў дастаткова высокія, але ўсведамленне і сістэматычнае выкарыстанне ў сваей рэальнай практыцы для вырашэння канкрэтных задач яўна недастатковыя. Значнай часткай студэнтаў псіхолага-педагагічныя веды толькі актуалізуюцца з акцэнтам часцей за ўсё на вылучэнне асноўных паняццяў, класіфікацыю іх без уліку і разумення сувязі паміж асобнымі функцыямі, іх месца ў рэгуляцыі і вырашэнні будучых практычных задач.

Аб псіхалагічнай падрыхтоўцы спецыяліста часцей мяркуюць толькі па тым, як поўна ён раскрывае азначэнні, сістэмы навуковых паняццяў і, у лепшым выпадку, ілюструе асобнымі прыкладамі іх сутнасць. Неабходна падкрэсліць, што гэтаму садзейнічае своеасаблівае выкла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ